ДЗЯННІЦА

Асобны №. каштуя усюды 35 кап.

— Вестка Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту. —

№ 33

	ГАЗЭТА КАШТУЯ:						
	На 12 мес.	На 9 мес.	На 6 мес.	На 4 мес.	На 3 мес.	На 2 мес.	На 1 мес.
У Расеі	15р.—к.	11р.50к.	8р.—к.	5р.20к.	3р.90к.	2р.60к.	1р.30к.
За граніцу	20р.—к.	18р.—к.	12р.—к.	8р.70к.	6р.—к.	4р.—к.	3р.—к.

Калі выпісваяцца разам некульні №№, та робіцца уступка на 20%.

Перамена адрысу каштуя 50 кап.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52. Т. 1-51-63.

Масква, 1918 г. 7 Акцябра. Выходзіць ня меньш чатырох разоу у месяц. І-й год выданьня.

Канцылярыя Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту адчыняна што дня, апроч сьвят, ад 10 г. да 4 гадзіны дню.

Ад Беларускага Нацыянальнага Камісарыяту.

Беларускім Нацыянальным Камісарыятам адчыняны атдзелы Камісарыяту: у г. Вітабску (Сувораускyая, д. 48), у г. Смаленску (Б. Казанская, 14) і у Петраградзя (Тэатральная, 3). Па справам беларускім радзіцца усім зварочвацца па гэтым адрасом. Там жа прадаюцца беларускія кніжкі і газэта „Дзянніца“.

Б. Н. К.

Масква, 7 акцябра.

Надоячы у забранных чэха-славакамі разам з контар-равалюцанэрамі мейстах, у горадзе Уфе, адбылася так празываная „гасударская нарада“, зробляная цэлымі дзісяткамі варожных радавуй уласці правіцяльствау, якія, нібы грыбы мухаморы, спора павыросталі пад аховаю чэхаславацкіх ды белагвардзейскіх штыкоу. На парадзя кіраунічую скрыпку ігралі правые с.-р., якіх там была маснейшая фракцыя. Гэтая партыя, сцяраушая падтрымку сабе ад працоунаго народу, пакінутая ім усюды, пярайшла на службу да яго варагоу і стараяцца поруч с грашаунікамі ды памешчыкамі пад штандарам „барацьбы за едзіную Расею і Устаноуны Збор“ атабраць усе заваевы равалюцыі і скінуць Радавую Уласць. Усюды, дзе толькі ей удаецца, яна паднімала і паднімая белагвардзейскія паустаньня і абедзвіма рукамі хапілася за чэха-славакау, якіх празвала „народнаю армеію“ і весь час вядзе іх на вайну за пабору над равалюцыяю. Замацаваушыся крыху у Прыволжаскум краю, на кароткі тэрмін забранум ад Радавае Расеі, яна, гэтая партыя правых с.-р. ці спраудняй, правадыры яе (бо прыхільнікау у ея зусім няма ні сярод селян, ні тым боляй, сярод рабочых), і зрабіла гэту нячэсную, контар-равалюцыйную нараду. На парадзя выявілася гострая нязгоднасць у думках і разуменьню на конт узглядау на бягучыя справы і вырабкі пляны (нібы) «збароны Расеі ад бальшавікоу і іх прыяцяляу-немцау», Прадстаунікі рожных «правіцяльствау», як Сібірскаго, Арэнбурскаго, Уральскаго і др. разам с прадстаунікамі грашаунікоу, буржуазеі, чорнасотнікау-кадэтау і багатых-кулакоу, сабраушы мясную грамаду, дамагаліся пайсці на тоя, каб скасаваць нават і дапаміны заваеу равалюцыі і паставіць у Расеі самадзяржау'я (заява Ц. К. кадэтау). Правыя с.-р. угамоньвалі іх спусціць крыху у бок народаўласця (бач уласці буржуазеі і кулачаства). У канцы усе сышліся на выраблянуй с.-р. прапазыцыі і прынялі яе.

Што ж із сябе выказвая прынятая раднякамі, сацыялістамі-згоднікамі і буржуазеяю на Уфімскуй парадзя агалоска? Калі прагледзець ея, та гэта с пачатку да канца цэлы цуг контар-равалюцыйных мерау і спосабау, якімі гэта гнусавая сямейка думая будаваць, прагнаушы бальшавікоу, Расею. Гэтта, бяручы ад „барацьбы за аслабаджэньня Расеі ад бальшавікоу“ маяцца: і няпрызнаньня Брэскаго замірэньня, і атрадзеньня крэпкай армі, у якой няпавінны быць арганізацыі палітычныя ды уведзяна царская дысцыпліна, і склікаць Устаноунаго Збору, і отдача усіх правоу памешчыкам ды грашаунікам. Адным словам — усе тоя, што расейскі працоуны народ пяражывау да равалюцыі ня толькі акцябярскай, а і февральскай. Праўда, паміж гэтых адкрыта чорнасотніцкіх радау «аднауленьня» Расеі, укрэпляны дзеля завабы і прыкрыцьця і ня которыя нібы дэмакратычныя пунты, як: замацаваньня фэдэрацкаго устрою, поуная прызнаньня свабоды прафэссыянальнаго аб'яднэньня і... нацыянальная палітыка на пачатках прызнаньня пэрсанальна-тэрытарыяльнай аутаном'і народнасцяу. Цудоуняй і сьмяшней усяго апошняя, бо пярад гэтым маяцца іншая пунта гэта — злука усіх частак Расеі «на фэдэрацкіх пачатках» пунты, вядома, з іхнім буржуйным разуменьням дамакраства. у якой уходзіць адна дробная і бойная буржуазея, уцягнутыя ля прыкрасы і выкуленьня свае той жа суменнай дэмакратычнасці.

„На парадзя былі прыпадковыя рабочыя і селяня», былі і прадстаунікі «рожных нацыянальнасцяу», ад казакоу (харошая нацыянальнасць!) да эстонцау нават — дастатых ля убору.

Вось ля гэтых «прадстаунікау „і патрабавалася уся іх ліберальнасць і са свабодаю прахвясіянальнаго аб'яднэньня і с фэдэрацыяй ды персанальна-тэрытарыяльнай аутаноміяй народнасцяу... але бяз усякаго дапамінаньня аб зям і... Усімі гэтымі, абяцанкамі адкрытыя варагі працоунаго народу і заваеваных ім правоу у ва усіх вобласцях люцкога жыцьця, занавешваюць гострасць чорнасотніцкіх чэха-славацкіх і белагвардзейскіх штыхоу, якія, усім ведама, нясуць на сабе панства прыгону і занявальненьня. Гэтымі обманнымі пацехамі - усе злыбядні расейскай распублікі, цешучыся у забраных імі мейстох амартаваньням рабочы.., доўгагадзінным днем працы, устройствам багатага пахаваньня цара кравасмока і чорнасотніцкіх гэнералау тужацца спакусіць працоуны народ, выхаваць у яго спагаду да свае ліхоя працы.

Папіхачы іназемных грашаунікоу і хаурусьнікі расейскіх—правыя с.-р. і іх сябры так сама хлусна-сацыялісты думаюць пярацягнуць да сябе і працоуны народ быушых прыгнечаных нацыяу, карыстаючы іх цяперашнім цяжкім палажэньням... Ціж дасягнуць яны і саправуды чаго кольвячы? Ціж паверыць ім хоць адзін працаунік беларус, латыш, літовяц, фін? Ці ня прыдзяцца ім абмежвацца гнуснымі вандроунікамі, регенатамі гэтых народау, як той «эстоняц», німа ведама скуль узяушыся ля прадстаунііцтва на «государскай парадзя»? Бадай, што гэта апошнія патугі іх, бо працоуны народ усіх народнасцяу с кожным часам боляй і боляй разбіраяцца хто яго прыяцялі і хто варагі, і бачучы варагоу сваіх у тых, хто сапрауды імі і есцяка, ня сдабруя з імі, сказаушы:

Прэч са сваімі прадажнымі завабамі, якімі вы хочаця завясці нас у прыгон палітычнаго, эканамічнаго і нацыянальнаго рабства!

Чые грошы.

Весь ужо восімы месяц, як у Мінску жыве так празываная Беларуская Рада з заложаным Сакратарыятам Беларускай Народнай Незалежнай Распублікі. Цэлых сем месяцау займаяцца яна працаю над узбудаваньням Беларусі, над атдзелам яе ад „Расейскае Бальшавіцкае Распублікі“, над прадажаю яе рукамі буржуазеі у кіраунісцвя з Скірмунтам і хэураю у рукі Скаралацчыня ці немцу. Сябры Рады і Сакратарыяту збіраюцца на засяданьня, выдаюць кніжкі, і газэты раз'яхджаюць пасланцы і на Украіну, і у Літву, і у Германію. Кінуць граматы і вырабляюць законы—адным словам „вядуць“ гібяль і дзеля яго атдаюць сілы боляй сарака чалавек людзей. Гэтых людзей трэба карміць, трэба мець грошы на выданьня кніжак і газэт, на паездкі, на рожныя закладаньня Гандлевых Палат і іншая. І Рада грошы мая. Мая іх ды ня мала.

Пры уступя у Мінск немцау, яны забралі ад Рады боляй паутары соцян тысчау рублеу і дасюль ня вярнулі. У аугусця месяцы Рада, тым ня меняй, выдала сваім сябром жалваньня за тры месяцы па 600 руб. Тым жа аугустам яна адпусціла Мінскаму Інсцітуту, які эвакуваўся (пераехау ізноу у Мінск з Яраславу) да новаго году 50.000 руб. Рада, даляй, адчыніла юбілевы дом, адчыніла дзяржауны цяатар, выдала шмат кніжак, і газэту выдае, закладая камісі па рожным справам і плаціць грошы працуючым у іх людзям, трымая гандлёвыя палаты. На усе гэта трэба процьма і процьма грошы пры цяперашняй даражыні. А тым часам сама сябе Рада гэта выдае за бедных рахманых сацыялістау. Дзе ж бяруць гэты нявычаеныя галякі такую уйму грошай ля свае няпрыемнай працы?

Вось гэта пытаньня—самая казытная, самая цікавая пытаньня. І мімвольна напрошваяцца яно кожны раз, калі прыходзіцца казаць што кольвяк аб працы Мінскаго беларускаго правіцяльства.

Дзе бярэ яно грошы?

Ведама, сваіх грошай яны ня робяць і зарабляных ня маюць і ім дае іх чыясь шчэдрая, але ня бязкарысная рука. Адкуль жа яна працягаяцца так легка з поунаю машною, і якая ласка вымушая яе на гэта? Ня цяжка дагадацца, што дае гэты грошы ахоуваную польскімі памешчыкамі і беларускай буржуазеяй Беларускуй Радзя ня працоуны народ. Ня цяжка дагадацца, што грошы ей ідуць з цемнаго шчыльнаго куточку, у яком, напэуна, сядзяць варожыя сілы ля беларускаго працоунаго народу. Хто яны, у яком кутку сядзяць—і гэта троха вядома.

С першаго часу свае працы Беларуская Рада жывілася грашыма Украінскае Рады. Гэты дзьве сястры падтрымоувалі адна другую, ды мелі карысць адна ад другой. Украінская Рада, прадаушая свой працоуны народ нямецкуй і расейскуй буржуазеі, ня шкадавала грошай, каб даць жыцьціо і змогу і Беларускуй Радзя зрабіць тоя самая. Тут была першая мапонка шчэдрае буржуазеі якая дала, 300.000 р.

За Украінскаю Радаю, кончыушаю так няпачэсна свае благоя жыцьце, ідуць другія прыяцялі. Карысная ля польскіх памешчыкау „Беларуская Незалежная Распубліка“ дастала сабе цеплую спагаду і у іх. Рухавы, „свядомы беларус“ п. Скірмунт дастау грошы ад сваіх прыяцяляу і пачау выдаваць газэты і кніжкі. „Беларускі Шлях“—гэта люстра чорнасотніцка-памешчычай думкі—вось тавар на беларускум незалежнічум рынку, купляны і створаны памешчычымі грашыма. Але і іх было мала. Жыцце і дзеяльнасць Рады вымагая аграмадных грошы і іх пазычая той жа стан багатых іншым спосабам. Надоячы мы даведаліся што Рада Беларуская робіць пазычкі на Украіне (займы). Украіна, якую прыкрывалі папераж падтрымоувалі нямецкім штыхом Скарападскі, цягне цяляй адрываць

сваю машонку прахадзімцам з Беларускае Рады. Ды як жа ня адчыняць яе? На вошта шкадаваць грошай калі яны могуць вярнуцца у некулькі раз карысьней: прынясуць працэнты, зробяць падтрымку варагоу Радавае Расейскае Рэспублікі і могуць быць самі вернуты, бо усякая пазычка забясьпячаяцца. Чым жа, цікауна, забязпечыла Беларуская Рада сваю пазычку? Што абяцая яна у замен грошай на той прыпадак, калі па якім-кольвяк прычынам ня зможа атдаць іх? Есць пэуна, што яна нашла у Беларусі такоя багацьця, якоя пасуліла у забяспеку на конт ня выплаты пазычкі. Покуль ня позна, яна стараяцца рабіць сваю паганую работу раструхаханьня агульналюдскога багацьця: яна можа уступіць кусок зямлі дзе-кольвячы на поудні Беларусі і можа залажыць багатыя дарагія лясы, якія цяпераka маюць быць дастаткам працоунаго беларускаго народу. Апошняя пэуняй першаго. Магло і саправуды стацца, што пад пазычкі грошы у Скарапашчыня памешчычая Беларуская Рада закладая скарб Беларусі--лясы. Тады Беларусі грозіць шкодная страта яе багацьця, бо Скарапацкія грашаунікі пастараюцца злушчыць беларускія лясы. Можа быць, што і другую бязпеку абецала Рада, толькі якая б абеца ня была, усяроуна яна узята ад працоунаго люду, з яго уласнаго дабра, і пры дрэнных варунках далейшаго жыцьця Беларусі, гэта дабро пойдзя на карысць і умацаваньня варагоу яго. Ведома, „прыяцелка“ беднай Беларусі, „век пагарджанай“, ахавальніца яе, Рада, ня лічыцца з гэстым. Ей трэба вясці сваю працу як мага хуччэй, карыстаючы пахкадзяшчым часам, і лічыцца бракуя. Вось мы і бачым—як шчыра, агулам і кавалкамі гіня праз яе працу Бацькаушчына беларуса-працоуніка... І баліць наша сэрца, і кіпіць у нас злосць ды устае пытаньня. Няужэ ен дазволіць у канец прадаць яе і сябе ліхім варагам? Няужэ Беларусь адыдзя у рабства зруйнаванай? Есцяка знак, што скора мінецца панства Беларускуй Радзя і Беларусь будзя сапрауды вольна. Каб жа хуччэй ен прышоу!

Шчыры Беларус.

Грап Чэрнін аб новым парадку у сьвеця.

Газэта «Новая свабодная Прэсса» падрукавала спераду сваіх лістоу пад званьням «Разаружэньня і трэцейскі суд» доугую стацьцю бышага міністра іназемных справау Аустры грапа Чэрніна, дзе іон ва уступленьні к апошнюй рэчы статс-секрэтара д-ра Зольва указвая, якім спосабам нават і у законадаучых інстанціях Бэрліна атрымала мейсца думка, што сучасная вайна павінна узрадзіць іншы устрой сьвету і што не у павялічэньні вааружжэньняу, а у міжнародных згодах палежыць шукаць забезпячэньня мінаваць вайны у будучыня. Потым грап Чэрнін цыціруя закладныя думкі з нядауна вышаушае брашуры Грэя (англіцкае). «Leadye of Nations» (хаурус народау), што замірэньня нямагчымо да тых часау, пакуль Гэрманія ня згодзіцца с тым, каб шукаць спосаб і дарогу к заменя ваенпае сілы. дзеля трэцейскаго суда, "і падчорквая, што гэтая закладная думка іосць баязнь Англі новае будучае вайны з боку мацнейшае Гэрмані, чым Ллойд-Джордж падбухторвау народ ужо уперад. Разуменьня англічапау аб Гэрмані заложана, аднака, на хвальшывуй ацэнцы псыхалогіі нямецкаго народу, бо нямецкі народ у аграмаднуй большасці па перадзя са сваім кайзэрам хоча усамдзеляшняго пачотнаго і на доугі час замірэньня; немцы ня думаюць аб тым, каб скарыстаць замірэньня, як перадышку к іншуй вайне. Але з гэтаго няразумэньня узгарэлася вайна, і яна будзя зараджацца, пакуль трымаяцца гэтая няразуменьня. На самум дзеля Гэрманія, як і мы (аустрыякі) хоча пачотнаго замірэньня, яна ня хоча ніякаго валадарства над сьветам, ні далейшае вайны, ніякаго уціску чужых народау. Потым грап Чэрнін указвая на развітую ім, у вядомуй рэчы у Будапэшця, думку аб новум усьясьветнум парадку і радзіць, каб Гэрманія узяла на сябе кіраупіцтва. Грап Чэрнін мысліць, што, калі заканадаучыя установы Бэрлінскаго Кабінету цяпер перад усімі прызналіся у гэтуй думцы і калі мусібыць супроць гэтаго прынцыпу ня будзя спрачацца так сама і міністар іназемных справау грап Бурыян, та німа нічога, што стаяла б на дарозя к таму, каб распрацоуваць закладзіны гэтаго новаго устрою сьвету і з імі стаць перад усімі народамі.

Р.

Вольная Беларусь.

I

Замірэньне у Брэсця было ня згодаю двух праціунікау, адзінакава стомляных вайною і жадаушых найці тую сярэднюю мяжу, якая б падзяліла на роуныя часткі інтарэсы і выгады іх, але жорсткім вынуленьпям дамаганьня імпэрыялістау чацвярнога хаурусу да найбольшае пажывы. Супэуня здаваляючы падкасць нямецка-аустрыйска-турэцкіх грабіцеляу і абяздольваючы адцураушыся ад вайны працоуны народ Расеі, гэтае заміреньне ня магло забязпечыць моцнасці яго на доугія часы. Нават імпэрскія сацыялісты Германіі, ня лічучы ужо пязалежных сацыялістау, напаміналі правіцяльству, што грабіць сумежныя усходныя народы нельга, што такое замірэньне ня дае надзеі на супакой і добрыя адносіны с Расеяй у будучыня. Але на гэтыя рэчы ня зварочвалі ніякае увагі, і нямецкія генэралы гналі сваіх салдатау усіо даляй на усход, забіраючы цэлыя губэрні і карыстаючыся ліозунгам самаапрадзяленьня народау. У закладзіня свайго погляду—варагі сацыялізму, нямецкія камендапты касавалі усе установы народнае уласьці і уводзілі старыя абурапыя акцяберскай равалюцыяй органы управы. Месцовыя буржуазныя клясы, прыдаудяныя равалюцыяй, пабачылі у нямецкіх лейтэнантах сваіх лепшых абаронцау і радасна іх сустракалі.

У сваіх рэчах яны дзякавалі за аслабаненьне ад бальшавікоу і прасілі дазволіць ім адбудаваць свой урад. І вось залажыуся цэлы гурток „незалежных, самасційных, дзержауных!“

У кіраваньня іх станавіліся трапункОвыя людзі, ня меушыя ні гасударсцвяннаго гопыту, ні разуменьня сучаснае псыхалогіі народу і яго патрэб, ні падтрымаяньня з боку шырокіх працоуных массау, якія цяпер усюды становяцца у уласці. Зложаныя праз гістарычную толькі абмылку, гэтыя правіцяльства і трымаліся толькі на аружжы тых, хто гэтую абмылку зрабіу. Але tmpora mutantur! Аружжо гостра с абудвых канцоу, і яно ботам вайны можа прытупіцца с аднаго канца, і тады станя ясным, што закладаць сваю сілу толькі на аружжы нельга.

Папіраючыся пад аховаю нямецкіх гэнэралау зварот да стараго парадку, скасаваньне большасці палітычных і акапамічных правоу, атрыманых працоуным народам праз сацыяльную равалюцыю, нешчадныя рэквізіцыі і абіраньне народнаго дабра у занятых мейсцох павялічыла злосць народа да немцау і мейсцовае буржуазеі. На Украіня, Беларусі, Ліфляндзі узгараюцца бунты супроць немцау і панау і замест жаданаго так „парадку“ супакою і безатказнаго паслухменьня трэба вясці усамдзеляшнюю вайну з народам, трэба трымаць шмат войска, як дзеля адоляньня бунтуючых, так і зніштчэньня мецяжу у сваіх уласных вайсках, якія так сама та тут, та там начынаюць спрачацца свайму начальству. А тым часам войска трэба шмат і па заходні фронт, дзе ужо больш, як месяц ідуць страшэнныя бойкі, дзе немцам ледва удаецца прытрымаць наступ англа-французау. Гэтыя бойкі, што вядуцца с крайняю упартасцю, бо немцы прагуцца падтрымаць цэласць свайго фронту, вырываюць з радоу тысячы і дзесяткі тысячау людзей. Вось туды і трэба немцам народу; бяруць салдатау з занятых мейсцоу; яны часта адцурваюцца ісці на заход. Складаяцца кепскае палажэньне дзеля немцау, і ужо большасць таго самаго рэйхстагу, які калісь-то пахваліу Брэскае замірэнье і шкадавау, што мала яшчэ узята ад Расеі, гэты рейхстаг цяпер заяуляу аб патрэбнасці самаапрэдзяленьне народау на усходзя. Дык вось калі спагадалі! А уперад ці ня казаліб яны, што самаапрэдзяленьне зроблена ужо? Мусібыць, гэтае слова разумеяцца у залежнасці ад тых ці іншых варункау. Ня сулілі добрыя варункі дзеля немцау у сучасны мамэнт прымусілі іх адцурацца ад палітыкі самаапрэдзяленьня зверху, і яны рашылі аслабаніць цэлыя занятыя імі землі, вырабіушы загадзя дадаткавую згоду, па якой яны патрэбуюць сабе каля 6 мільярдау грошай ад Расейскаго Савецкаго ураду. Нехай бяруць ды хуччэй уцякаюць.

У залежнасці ад выплаты гэтых грошай знайходзіцца аслабаненьне усяе Беларусі, якая уся па дадаткавай згодзя, замацованай у Бэрліня 7 сенцябра н. ст., адыходзіць ізноу да Расеі. Ужо цяпер стау вольным Лепяльскі павет Вітабшчыны; праз некулькі дзіон чарод за Сеннянскім паветам Магіліоушчыны. Воршанская вакруга так сама скора будзя свабодна ад немцау. У далейшум па крысе асвабадзіцца і уся Беларусь. У звязку з яе вызваленьням ад немцау стаіць пытаньне і аб арганізацыі уласці і аб самаапрэдзяленьні. Аб апошнюм доугае рэчы быць ня можа. Жаданьня усяго працоунаго белорускаго народу нарыхтованы да злучэньня з Расеяй і пастановы селян быушых нязахопляными мейсцоу і радасць аслабанёных лепяльскіх жыхароу ясна сьвятчаць аб напрамку іх палітычных дамаганьпяу. Крыху важней пытаньне аб арганізацыі радаваго устрою на мейсцах і рахунак с тою уласцю, якая ліпіць у Менску. Аб гэтым-у чародным нумары.

Н.

Байструк.

IV

(*Працяг*).

Асалавелай, чуючы цяжкую утому, адваротную млявасць, вайшла Гапа у сенцы і моцна ды глыбока уздыхнула. Цемра абдала усю яе, схавала у сабе, і ей стала нібы ляхчэй. Яна павярнулася на права і обмацкам знашла услон, села на ем, колькі хвіль пасядзела нярухома, потым стала раздзявацца. Марудна, с прыпынкамі зняла перш чаравікі, потым плацьця і у адной ісподнюй спадніцы пахіліла к ложку, дзе з вечера мацi ей паслала пасцель. Гапа у цемры ня различыла шыркі галу, атдзельваючаго услон ад ложку і, зрабіушы лішні крок, стукнулася каленам аб рубец сценкі ложку. Зашчымела боль і расплылася па усім целі, яна ж патом нібы і ня балела ей, нічым ня адказала, на гэта, а падпялася на ложак, лягла і стала думаць. Думкі, аднак, ня йшлі у голау цалкам, а рваліся і блыталіся адны з другімі і неяк асобна ачувала гнялі на голау і на усе цела, ажно Гапі рабілася моркатна. Няупрыкметку зусім яна заснула; толькі чутка і трывожна спала. Гук пастуховы трубы, рык кароу і мэканьня авечак, скрып варот у хляве і вешніц, нават гоман—усе чула яна, вядома, ня гэтак выразна, нібы на яву, але чула. Усю пору варушылася, варочалася з боку на бок, та скурчвала ногі, та выцягала іх. Сніла страшныя, дзікія сны, што было відаць па яго гаворцы праз сон.

Маці, тупаючы па сенцах, раз-поразу кідала пагляд на дачку і дзівілася яе ня спакойнаму сну, ды хрысціла яе.

— Што то мая быць з Гапкаю, — скардзілася яна мужу, вайшоушы у хату: —Нешта вельмі трывожна яна спіць сеньня. Ці ты ня чуу часамі, калі яна прышла з гульні?

— Не, ня чуу.

— Хацяб з ею нічога ня здарылася...

Меньшая сястрыца, чуючы гэта, выбягла пагаядзець, і прачыніла сенцы. Святло, варваушыся праз дзьверы, ахапіла усе і Гапу на ложку, ажно разбудзіла яе.

— Лізка, ужо к цэркві званілі?—запытала яна сястрыцу, калі адплюшчыушы вочы угледзяла яе ля ложку.

— А ужо, вось мы с татам пойдам,— адказала тая, і у свой чарод запытала:

— А ты, Гапа, на абедню пойдзяш?

Гапа нічога ня адказала, а, адвярнуушыся к сцяне прынялася думаць. Лізка зачыніла дзьверы і пашла у хату. Сон зусім пакінуу Гапу, хоць яна і чулася ня выспаушай, і яна стала маляваць пляны, як і што ей быць пошля усяго тэго, што учора убачыла сваімі вачыма. „Ніколі я ня чакала ад Піліпа... Што ж цяпераka? Не, гэта гэтая зараза в навата, усе яна нарабіла... Нельга пакараваць, нельга ні зашта... Чакай, я ж табе адамшчу! Будзяш ведаць, валацуга ты няшчасная, як прашкодзіць другім, як адбіваць каханкау. Пры-ы-е-э-ха-ала-а! Імасць вялікая..! А Піліп—той Піліп, што заверва у весь час, што кляуся, што-о-о... выманчыу ад мяне самая дараго-о-я-а... Ох-хо-о. І так ліогка кінуу, так лехка адвярнууся..- Што ж скажа мама? І, утуліушыся у падушку, яна доуга плакала, горка-горка узрыдвала...

— Гапка, уставай, дачушка, снеданьня гатова,—пазвала яе маці.

Гапа пацягнулася, выцярла слезы навачах і падпялася. У кароткі час злезла з ложку, прыадзелася, памылася і увайшла у хату. Маці зірнула на яе і зразу скеміла акрываючы тварыну дачкі смутак і маркотнасць.

— Што с табою, Гапка? Ці ня хворая толькі ты?

Гапа крыху памаучала раздумоуваючы, казаць мацяры аб усем, ці не. Потым адказала:

— Так сабе, нічога.

— Чаго ж ты гэткая смутная? Кажы, дачушка, ня бойся.

— Да нічога.

— Кажы, кажы...

— Эй, мамачка-а, зусі-ым яно ня варта казаць... Ведаяця-а...—пачала ня смела Гапа.—Ведаяця, што-о... Піліп ужо мяне пакінуу... з пасасоркаю ужо-о...

Маці, як трымала у руках рушнік, так і выпусціла яго, жахнуушыся:

— Ці можа стацца?!

— Вось учора мы з Гэляю падсачылі: сядзеу у Цімкі у дварэ з Юзяю і весь час абнімауся-а. І ня толькі учора, а ужо праз цэлы тыдзянь з ею водзіцца. Ні са мною, ні з Гэляю ня страчауся-а ні разу, а Раману казау, што: „Годзі-ы ужо валандацца з Макарышкаю“.

У Гапы выступілі слезы; маці зрабіла сур,езную міну.

— Вось і глядзі ты,—праказала яна цверда і злосна:—вось і глядзі ты! Такі адбіваяцца на ем дух котлішча. Зараза-заразаю, жулік-жулікам. Бацькава спаганяя. Ого-о! Ужо на ем відаць зразу... Пі-іліп, Пілі-ып! Да гэта вядома... А тут яшчэ ліха прыгнала валацугау гэтых, шляхтау паганых... Мэцыя пашлася — байструк. Каб хто які‘ а то просты байструк, прымачка... Паскуда прымачка—і на: добра вельмі, што морда гладкая... Выгадавалі, выпасьвілі...

— Што, яна байструк, Юзя, бач?—с цікам, забываючы аб усім, спытала мацяру Гапа.

— А ты ж думала што — байструк, прыняты у прымы байструк. Дзеука некая, панская служка, кінула, утапіушыся з сораму, а пасэсар гэты узяу...

Гапа была здавольна гэтаю навіною і у яе радзілася жаданьня хуччэй жа вылаяць гэтым словам Юзю, якая атабрала ад яе усю надзею, усе шчасця. Але адно нешта раптам узварушылася у яе сярэдзіня, і яна задумалася, пакінуушы разам блісnуушая хаценьня. „А бач, можа стацца, што і ты“... мігнула міжвольна некая таемная ушічышча. Гапа ажно садрыгнулася ад яго і апусціла вочы уніз, каб маці ня скмеціла.

Маці, тым часам, яшчэ доуга лаялася, гуторачы з дочкаю і суцяшаючы яе.

— Нічога, хай толькі ен кіня, цябе, та мы будам ведаць, што зрабіць. Яму так ня мінецца,—казала яна Гапе.

Ткачыха.

За варстатам дні і ночы
 У духаце нязноснуй,
Я старэнна і ахвоча
 Тку-ліцую кросны.
Скрып чалядау песьню грая,
 Рыпаюць вітушкі,
Чаунакі два с краю к краю
 Летаюць бы птушкі.
Рукі-вуды іх хапаюць,
 Ня даюць прамаху...
Дні гадзінамі мінаюць
 У работнум жаху...
Возьмя хэнця—і даволі...
 Што бы разрабіцца!
Локцяу с пару, або й боляй
 Саскладаць па ніцца!
Эх, бы, здэцца, дзень працягся
 Хоцькі удва, як трэба!
Чалавек бы усе запасся
 Ад работы хлебам.
А то дрэнчыш бяз спіханьня,
 Градам пот ліецца—
А ад працы, ад стараньня
 Й чуць ня астаецца.
Што парадзіць—трэ гадзіцца
 Покуль прыдзя змена.
Дык пчыльней жа нітка к ніцца
 Цісніся старэнна!
Ня стамляйцяся ні чуткі
 На падножках ногі,
Ня схінайся, трымай прутка
 Спіна пад знямогай.
А вось боляй выжам тугі
 І крыху падспору...
Гэй, у бок, нядолі слугі,
 Вам я тку пабору!

Цішка Гартны.

В Культурно-Просветительный Отдел Белорусского Национального Комиссариата.

ОТЧЕТ

о летнем семестре Белорусск. Народн. Унив.

11-го июля сего 1918 г., согласно намеченному плану, началось чтение лекций по белоруссоведению на летнем семестре Белорусского Народнаго Университета в помещении Пегагогического Института имени П. Г. Шелапутина в Москве. Общее число лекционных часов достигло 101, из которых 6 было отведено для экскурсий.—С 11-го июля по 12 августа с. г. были прочитаны следующия лекции:

1) Академик Анучин Д. Н.—К вопросу о территории Белоруссии . . 2 ч.
2) Проф. Пичета В. И.—История Белорусского народа . . . . . . 22 „
3) Пр.-доц. Чепурковский Е. М.—Антропология белоруссов . . . . 3 „
4) И. П. Силинич—Географический обзор Белоруссии. . . . . 6 „
5) Пр.-доц. Расторгуев П. А.—Белорусский язык . . . . 8 „
6) Д. Ф. Жилунович—Обзор белорусской литературы. . . . . 2 „
7) Проф. Ясинский А. Н.—История образования в Белорусии . . 14 „
8) Е. С. Канчерг—История национального и революционного движения в Белоруссии . . . . 4 „
9) Пр.-доц. Колмогоров — Этнография Белоруссии . . . . . . 8 „
10) Проф. Фортунатов—Экономия сельского хозяйства. . . . . . 7 „
11) Эйтингер Г. Р., ассистент Петр. Раз. академии—а) Лесное хозяйство. 2 „ в) Он же — экскурсия на лесную дачу академии . . . . 2 „
12) Сабашников А. В., ассистент Петр. Раз. академии—Земледелие . 4 „
13) Минин А. Н.—Кооперация . 5 „
14) Добровольский В. Н.—Элементы театра в народной белорусской поэзии . . . . 2 „
15) Пр.-доц. Сергеев — История революции во Франции. . . . . 2 „
16) М. И. Селищенский, препод. Инст. им. П. Г. Шелапутина—а) К вопросу о методике родиноведения. 4 „ в) Показательная экскурсия на дачу Ноева (район Воробьевых гор). . 4 „

Как видно из приведенного списка, к чтению лекций удалось привлечь целый ряд известных специалистов из высших учебных заведений г. Москвы. При их помощи цикл лекций по белоруссоведению не только был приведен по намеченному плану, но еще и пополнен некоторыми дополнительными лекциями. (напр. лекции акад. Анучина и В. Н. Добровольского). Что касается слушателей Белорусского Народного Университета, то число записавшихся на лекции достигло 109 человек, а действительно посещавших лекции —57 чел., не считая случайных, непостоянных посетителей. Подавляющее большинство слушателей были учителя всех типов школ Белоруссии, в том числе и приезжие из оккупированной части Белоруссии. Для приезжих было устроено общежитие, которым пользовались 11 чел.

В виду того, что в течение июля и августа читались лекции на Всероссийских учительских курсах как по политическо-социальным вопросам, так и по обще-педагогическим, то во избежание параллельной работы, совершенно не оправдывающей расходов в виду небольшого числа слушателей, было достигнуто соглашение с заведующим указанными курсами В. П. Потемкиным, в силу которого слушатели Белорусского Народного Университета имели право посещать все лекции на Всероссийских летних учительских курсах, чем они в широкой мере воспользовались.

В виду невозможности собрать многолюдную аудиторию в условиях настоящаго времени, были приняты все меры, чтобы получить от лекторов рукописи прочитанных курсов (некоторыя лекции стенографировались). По напечатании оне должны составить сборник по белоруссоведению, который явится настольною книгою каждого учителя, работающего в школах Белоруссии. Частью для читанных лекций, а частью для будущих наглядных школьных коллекций по белоруссоведению был приготовлен ряд оригинальных географических и этнографических диапозитивов, материал для которых был заимствован главным образом из музея Московского Университета.

В общем надо признать, что цель, которую преследовали курсы по белоруссоведению, достигнута: слушатели вполне удовлетворены теми сведениями, которыя им удалось почерпнуть из прослушанных лекций, а учитель-белорусс, не имевший возможности приехать на курсы, будет в состоянии получить необходимыя знания из легко доступной для него книги, которая вскоре выйдет в свет. В этом, пожалуй, заключается главное значение курсов.

Для слушателей Белорусского Народного Университета, в часы свободные от лекций, в том же помещении Педагогического Института имени П. Г. Шелапутина, где читались лекции, была открыта педагогическая библиотека, состоявшая больше чем из 400 названий для ознакомления слушателей с новейшей педагогической литературой.

В заключение считаю своим приятным долгом отметить, что почти все приглашенные лекторы проявили сами большой интерес к делу возрождения Белоруссии и ея изучению и таким образом организация курсов заставила многих ученых уделить больше внимания Белоруссии.

Заведывающий Белорусским Народным Университетом **П. Урбанович.**

Москва 14 августа 1918 г.

Большой митингъ бѣженцевъ, проживающихъ въ Петроградѣ.

Въ пятницу 27 сентября новаго стиля состоялся въ помѣщеніи Народнаго Собранія (бывш. Дворянскаго Собранія, Михайловская, 2) многолюдный митингъ бѣженцевъ всѣхъ національностей, посвященный вопросу массоваго возвращенія бѣженцевъ на родину. Докладчиками на митингѣ выступали члены Петроградской Коллегіи о плѣнныхъ и бѣженцахъ и руководители отдѣльныхъ Національныхъ Комиссаріатовъ.

По общему вопросу о реэвакуаціи бѣженцевъ дѣлалъ подробный докладъ предсѣдатель Коллегіи о плѣнныхъ и бѣженцахъ тов. Крафельскій. Указавъ на работу Коллегіи, докладчикъ отмѣтилъ тѣ препятствія, кавія послѣдняя встрѣчаетъ въ своей работѣ. Главное препятствіе— очевидное нежеланіе допустить въ оккупированныя мѣстности трудовой элементъ Краснаго Петрограда, который внушаетъ опасенія боящимся „большевистской заразы“. Немало затрудненій и отъ измѣненій самой системы отправокъ. Практиковавшійся ранѣе способъ отправленія по національностямъ, въ послѣднее время замѣненъ территоріальнымъ. Особо отправляются: польскими эшелонами уроженцы 10 губерній бывшаго Царства Польскаго; прибалтійскими — уроженцы Курляндіи, Лифляндіи и Эстляндіи; литовскими—уроженцы Ковенской, Виленской и Гродненской губерній; бѣлорусскими—уроженцы Минской, Могилевской и Витебской губерній. Тов. Крафельскій заканчиваетъ отвѣтами на заданные вопросы и дѣлаетъ практическія разъясненія.

Послѣ т. Крафельскаго выступали руководители отдѣльныхъ Національныхъ Комиссаріатовъ. Отъ имени Бѣлорусскаго Отдѣла при Комиссаріатѣ по дѣламъ Національностей Союза Коммунъ Сѣверной Области сдѣлалъ обстоятельный докладъ управляющій дѣлами этого Отдѣла тов. **Ковшило.**

В своемъ докладѣ тов. Ковшило указываетъ, что на долю Отдѣла выпало масса препятствій съ реэвакуаціей бѣженцевъ-бѣлоруссовъ, которыхъ насчитывается въ Сѣверной Области до 300 тысячъ. Уже одно это число показываетъ, что реэвакуацію нельзя произвести быстро уже по однимъ техническимъ условіямъ. Между тѣмъ, по понятному желанію каждаго скорѣе возвратиться на родину, Комиссаріатъ осаждается массою бѣженцевъ,

V

Усю нядзелю Гапа ня пашла с хаты нікуды: усе было ей ня міла — мучыла адна думка, да якой прылучылася настойная, няадкарасная пытаньня: як жа тут адамсціць ім? Адамсціць—крычала уся яе істота, гукала сэрца. Гарэла цела дзікаю сіберпаю помстаю, якая ня глядзела ні на чога і гнала Гапу шукаць Піліпа і Юзі, хоць цяпер жа, хоць да іх у хату. Толькі холад розуму крыху стрымоувау яе пэнт, каб гэта ня абы як, з разгону усе зрабіла—а цішком, гладка, пляпова..

Пярад вечарам да Гапы зайшла Гэля з Карзунянкаю і засталі яе патрывожанаю, заклапочанаю. Гапа, прыветная, гасціннал і радая усягды ім, нібы і ня прыкмеціла на гэты раз — толькі скоса зірнула, ня вымавіушы слова, і зноу думала, як і да іх прыходу. Дружкі яе гэта скмецілі і пяраглянуліся паміж сабою; ім было няемка і яны ня ведалі, што ім зрабіць: іці назад, ці аставацца. Гэля чулася смялей другоя і зрашыла зачаніць Гапу.

— Гапа, мо пойдам на вуліцу? — запытала яна.

Гапа нібы ачухалася: падняла голау, паглядзела на таварышак і ня з разу атказала:

— Ну, выдам крыху.

Пры гэтум усе у траіх яны вышлі с хаты і селі на прызьбя. Селі і толькі ушчалі гутарку, як тут жа паміж іх чынна і паважна, бы назнарок, прайшлі Піліп з Юляю. Першаю прыкмеціла Карзунянка і штаухануза Гэлю, а тая ня змагла ня паказаць Гапя, якая сядзела з апушчанаю у ніз галавою. Угледзяушы, Гапа, ажно садрыгнулася і, нячаканна ля таварышак, у голас зло праказала:

— Вось звязаўся з байструком, што і вадою ня размыць...

Піліп с Юляю аглянуліся. Гэля с Карзунянкаю няемка адвярнуліся у другі бок. С хаты, праз вакно, выглянула Гапіна маці.

— Што, нябось ізноу у дваіх? — зло запытала яна.

— Але, вось пашлі,—адказала Карзунянка.

— Трэба было б каманям іх,—парадзіла яна дацца.

— Будзя і тоя,—адказала падбухтораная гэтым Гапа.

— Не, цетка, завідна так брыдка, — сумела яе Гэля.

— Ага, брыдка!—вырачылася яна: — табе брыдка, бо табе ні баліць, ні свярбіць... А нябось, каб так, як Гапя, ня тоя б сказала... Чаго там саромяцца! Тут ня да сораму...

Гапіна маці шчэ доуга так гаварыла, і гаворка яе пярайходзіла у настаяшчы крык. Дзяучатам рабілася прыкра, і яны адна другой даушы знак, намерыліся іці ад Гапы:

— Трэба іці спаць,—парадзіла Карзунянка.

— Але, заутра будздзень,—згадзілася Гэля, і, даушы дабранач, яны у дзьвех пашлі.

Гапа адна доуга ня сядзела. Маці ж хутка ушчыніла вакно.

Цішка Гартны.

Будзя даляй.

ВЕДОМОСТЬ

о числе беженцев белоруссов, о которых подано ходатайство в Московскую Центральную Коллегию, о возвращении их в оккупированную местность за период с начала резвакуации по 16 сентября 1918 года.

№№ по порядку.	Из каких губерний.	В какие губернии. Гродненск. Сем.	Гродненск. Душ.	Минскую. Сем.	Минскую. Душ.	Виленск. Сем.	Виленск. Душ.	Витебск. Сем.	Витебск. Душ.	Могилев. Сем.	Могилев. Душ.	Общ. число. Сем.	Общ. число. Душ.	Количество списков.
1.	Московской . . .	200	866	59	240	39	124	6	20	2	12	306	1262	Двести пятьдесят один
2.	Тверской	28	166	66	358	8	21	„	„	„	„	102	540	
3.	Нижегородской . .	146	1161	20	77	34	167	„	„	„	„	200	1405	
4.	Рязанской	889	4555	72	323	10	44	„	„	„	„	971	4922	
5.	Тамбовской . . .	1678	7938	214	1040	54	286	„	„	1	4	1947	9268	
6.	Воронежской . . .	377	1651	14	70	21	109	1	7	„	„	413	1837	
7.	Самарской	118	502	„	„	„	„	„	„	„	„	118	502	
8.	Калужской. . . .	195	947	„	„	„	„	„	„	„	„	195	947	
9.	Тульской	29	133	„	„	1	1	„	„	„	„	30	134	
10.	Пензенской . . .	238	1253	5	31	37	178	1	6	„	„	281	1468	
11.	Орловской	67	304	„	„	„	„	„	„	„	„	67	304	
12.	Ярославской . . .	29	137	31	121	3	13	„	„	„	„	63	271	
13.	Владимирской . .	373	2027	56	308	„	„	13	68	1	1	443	2404	
14.	Саратовской . . .	699	3452	47	682	14	61	30	169	„	„	790	4364	
15.	Симбирской . . .	39	163	„	„	„	„	„	„	„	„	39	163	
16.	Смоленской . . .	„	„	1	2	„	„	„	„	„	„	1	2	
17.	Новгородской . .	3	8	„	„	„	„	„	„	„	„	3	8	
18.	Уфимской	5	33	„	„	„	„	„	„	„	„	5	33	
19.	Костромской . . .	„	„	„	„	11	81	„	„	„	„	11	81	
20.	Могилевской . . .	1	3	„	„	„	„	„	„	„	„	1	3	
21.	Обл. В. Донского .	4	18	„	„	„	„	„	„	„	„	4	18	
	ИТОГО	5118	25312	585	3252	232	1085	51	270	4	17	5990	29936	251

Заведующий подотд. Статистики Беженского Отд.
Белорусского Национального Комиссариата (подпись)

АД РАДАКЦЫІ.

Рукапісы, якія прысылаюцца ля друку, павінны быць чытальна напісаны на адным бку паперы.

Няпрынятыя рукапісы звяртаюцца аутарам, калі ля перасылкі будзя прыслана марка. Малыя рукапісы ня варочаюцца зусім.

РАДАКТАР ПРЫМАЯ ад 11 да 4 г.

Радакцыя і Адміністрацыя: Масква, Паварская, 52, тал. 1-51-63.

задающихъ много такихъ вопросовъ, отвѣтить на которые нѣтъ возможности. Кромѣ того, Комиссаріатъ ставитъ своей задачей не только отправку на родину, заботу о самой перевозкѣ, но и оказаніе помощи при устройствѣ на мѣстахъ. Необходимо поднять жизнеспособность въ упавшей духомъ отъ потери имущества семьѣ бѣлорусса, нужно вселить въ него не только надежду, но и увѣренность въ лучшее въ ближайшемъ будущемъ. Въ этой работѣ Комиссаріатъ наталкивается на препятствія со стороны нѣмцевъ, которые опредѣленно тормозятъ работу, чтобы вызвать раздраженіе и недовольство среди бѣженцевъ противъ Совѣтской власти. Мало того, на мѣстахъ въ Бѣлоруссіи возвратившіеся бѣженцы сразу попадаютъ въ суровую кабалу, для нихъ тамъ начинается настоящее горнило мученій.

Но для Бѣлоруссіи наступаетъ свѣтлое время. Согласно дополнительнаго договора къ 6 ноября Бѣлоруссія очищается до старыхъ позицій. Тогда бѣженцы будутъ возвращаться и устраиваться, какъ дома, безъ тѣхъ мучительныхъ сомнѣній, какими терзается теперь каждый возвращающійся. Относительно дальнѣйшей реэвакуаціи и жизни въ тѣхъ мѣстахъ, гдѣ пока что оккупація не снимается, сказать въ настоящее время что-либо опредѣленное трудно. Принимаются возможныя мѣры къ выясненію. Для тѣхъ же, кто остается временно еще здѣсь, будутъ устроены общежитія, для дѣтей—школы. Сознавая всю важность экономическаго возрожденія края, Комиссаріатъ въ скоромъ времени начнетъ издавать спеціальный журналъ и газету, посвященные экономическимъ вопросамъ Бѣлоруссіи. Нужно надѣяться, что 2 милліона бѣлорусскихъ бѣженцевъ, будучи сорганизованы и проникнуты единымъ настроеніемъ и волей, создадутъ ту мощную единицу силы, которая сумѣетъ совершить возрожденіе края, построить его на новыхъ трудовыхъ началахъ.

Отвѣчая на заданные вопросы, тов. Ковшило указываетъ, что къ отправкѣ записано 82 тыс. бѣженцевъ. Въ первыя очереди будутъ отправлены неимущіе, безработные, больные или утерявшіе мужей или женъ, дѣтей или дѣти, утерявшіе родителей. Большія препятствія чинятся и со стороны осѣвшей на мѣстахъ буржуазіи. Матеріальная помощь здѣсь въ Петроградѣ оказывается всѣмъ, дѣйствительно въ ней нуждающимся. Неимущимъ бѣженцамъ выдаются и будутъ выдаваться пособія.

Затѣмъ выступали представители другихъ національныхъ комиссаріатовъ. Никакихъ резолюцій или постановленій, митингъ, какъ имѣвшій освѣдомительный спеціальный характеръ, не вынесъ.

Р.

З Рачыцкага павету Мінскай губ.

(Караспадэнцыя).

У пачатку сенцябра с./г. селяня Горвальскай валасці Рачыцкага павету, нявытрымаушы гвалтоу'я і здзекау мейстовай буржуазеі і нямецкіх парадкау, падкялі штандарт паустаньня. 60 чалавек злучыліся у дружыну паустанцау, забралі мястэчка Горваль, дзе пракалолі 14 немцау, між іх двух ахвіцэрау, і абвясцілі Радавую уладу.

З Горвалю паустанцы пашлі да вескі Слабодка, дзе стаяу атрад 4-го Украінскаго пагранічнаго корпусу, які вартавау на граніцы з Беларуссю. Вартавыя былі зняты і паустанцы захапілі казармы, прапанаваушы пагранішнікам здацца і атдаць варужжо. Камандзеры былі заарыштаваны. Пагранічнікі атдалі варужжо, усе ваенныя манаткі і абяцаліся слухаць камісара савецкаго.

Далей паустанцы рынуліся на Рачыцу, але гэкстрана з усіх бакоу падбеглі нямецкія атрады і змаглі паустанцау ды атабралі ад іх варужжо. Частку паустанцау пяралавілі. Аднаго ад камандзерау, Дубовіка, павесілі пяраднародня у Рэчыцы. Над другімі вядзецца слества, бо да ведама паветаваго старшыны і нямецкаго камяндапта дайшло, што па усім павету зарганізаваны такія паустанцкія дружыны, а Горвальская паустаньня едыны няарганізаваны выступ.

Вельмі страшыць начальства выступ усяго павету зразу і з за гэтаго усюды навальныя арышты. Атрад награнічнікау атдадзяны пад суд за змену. У звязку з Горвальскім паустаньям, нямцамі і украінскаю уладаю атданы прыказ заарыштаваць усіх сябрсу равалюцыйнаго Савету і мяне у тым ліку. Празыдуюму награжал смяртаваньня, другім—нямецкія руднікі. Дваіх арыштавалі, але яны уцяклі.

Тыт Рудэльскі.

М. Чарнобыль, Кіевскай губ. заарыштаваны усе дзеячы, тым ці іншым чынам памагаушыя замацаваньню у жыцьці радавуй уласці. Заарыштаваныя сядзяць у бані і мруць з голаду. Патроху адпраувляюць у Германьню на руднікі. У мястэчку асадная палажэньня: а 7 гадзіна нямможна выці на вуліцу. Вакол арудуюць парцізанскія атрады.

Т. Р.

М-ка Капыль, Мінскай губэр. У мястэчку страшэнна падпялася спякуляцыя. Мешчане спякулююць коньмі і каровамі, а жыды матэр'яю на апратку ды іншым крамным таварам. Грошы у усіх сталагібаль, акно за імі ніхто ня гоніцца і надта сталі бракаваць іх: хай толькі малая дзе дзірачка, ці крыху папмуляна—ані паказвай. І наагул грошай н керанскіх, ні марак ня бяруць ахвотна. Знайходзяцца з жыдоу такія, што адчыпяюць мепку старых грошы па новыя і за гэта бяруць добры інтэрас—па рубель двазлотку. З за таго, што дужа у ва усіх многа грошай, тавары с кожным днем даражэюць. Даражэя і яда. Масла каштуя 12 руб. фунт, сала 12 руб., хлеб 35 руб. пуд. Гэтаму памагая тоя, што немцы на Случчыну наладзілі страшэнную кантрыбуцыю і ускорум чася думаюць раквізаваць дабро... Сярод ахвіцароу быушых знайходзяцца контарравалюцанэры, якія выяхджаюць да чэха-славакау. У мястэчку палітычная жыцце замершы-толькі і дазваляюць рабіць спяктаклі, чымсь нашы хлопцы і карыстаюць.

Капыльскі.

Аб усім па троху.

З Беларусі.

У Полацкум павеці Вітабшчыны пачалі будаваць аграмадныя савецкія млыны. У Вітабскум павеця парашано зрабіць завод ля вырабу касцяное мукі.

Унівярсытэт у Вітабску.

Вітабскі народны унівярсытэт пярастроян на новы лад. Ен раздзеляп на дзьве часткі (факультэты): гуманітарны і ясцесцвяны. Пачатак навукі с 1 акцябра.

Бежанцы варочаюцца.

У Оршы з'явілася шмат бежанцау з Літвы, Беларусі і Польшчы, якія перш былі выехалі да дому, а цяперака ізноу вярнуліся назад у Расею. Яны кажуць, што у Радавуй Расеі жыць ляшей, ніш пад уціскам нямецкіх чыноунікау і вайсковых начальнікау.

Немцы гатуюцца выяхаць.

З Мсціслаулю пішуць, што ехдзіушы у Магілеу ля згавору з немцамі аб ачышчэньні імі Магіліоушчыны, губэрскі вайсковы камісар т. Ткачоу пярадае, што немцы адвозяць усе, што мая які—кольвячы кошт. Увозяць падзямельны цялеграф (кабялі), жалеза, сталь, мець, цынк, волава, нават скрынкі с пад кансэрвау. Здымаюць медныя клямкі з дзьвярэй. Ужо адвезяна да 60% ураджаю яблык, груш і інш. Немцы выцягаюць апошні хлеб ад людзей, пужаючы раквізыцыяй і разсылаючы усюды сваіх пасланцоу. Калі тав. Ткачоу падау пратэст супроць вывазу кабялю і казеннаго дарагога дабра, та немцы адказалі, што казенная ды царская дабро яны лічаць ваеннаю дабычаю.

Працоуная камуна з памешчыкау.

Веліжаскі (Вітабскай губ.) паветавы Зям. Атдзел пастанавіу усіх памешчыкау і іх даверапых бойных арандатарау высяліць з іх маенткау, сабрэць у яком—кольвячы адным мейсту і залажыць з іх прымусовую камуну. Хай працуюць!

Нядоячы арыштованы беларускі дзеяч, прысыланы сюды Бел. Радаю дзеля перагаворау с Радаю Камісарау А. Цвікевіч, аб прызнаньні імі Беларускай Распублікі, выпушчанна парукі А. Бурбіса і Няцецкаго.

Заарыштованы Усер. Надз. Кам, у аугусця месяцы супрацоунік Бел. Камісар. т. Я. Макарэвіч покуль што сядзіць у вастрозя. Следства аб ем ідзе хутка і ен, бадай, скора будзя выпушчаны.

Беларускі атдзел Національн. Каміс. Паупочных камуннау адчыняя дзьве работныя школы у Пецярбургу.

У Вітабску атдзелам Белар. Нац. Камісар'яту адчыняюцца тры вячаровыя школы граматы дзеля сталых і падрослых беларусау: 1) у памяшканьні 6 прыходцкаго вучылішча (Сенны пляц), 2) у памяшканьні 9 прыхоцкаго вучылішча (Орлоуская вул.) і 3) у памяшканьні першаго жапочаго прыхоцкаго вучылішча (1 раййоп, Гразная вул.).

Вучэньня будзя вясціся вячэрнімі часамі. Будуць абучаць пачатковуй граматця і чытаць лехка зразумелыя лекцыі па гісторыі, гэографі, ясцествоведаньню, гігіеня, гісторыі равалюцыйнаго руху у Расеі і па пытаньням беларусазнаўства.

З заграніцы.

Баугар'я змірылася с хаурусьнікамі.

Праз Бярлін навядамляюць, што Баугарыя зрабіла с хаурусьнікамі замірэньня, узяушы на сябе абаувязак атрэзаць чугунку паміж Бэрлінам і Канстанцінопалям. Гэтым Баугар'я разышлася з немцамі, з якімі хаурусавала чатэры гады. Зрабіць ле гэта заставіла вялікая утома вайною, якую Баугар'я взяла боляй шасці гадоу і з за гэтаго наборою ле французамі і англічанамі. Немцы паслалі свае войска на падмогу, а так сама каб сілаю прымусіць Баугарыю ня кідаць вайны.

У Турцыі бунты.

У Турцыі усюдах ідуць галодныя бунты. Нядоячы назначаная ля пасылкі на Капказ войска вымусілі пасляць на усмірэньня бунтау. У Канстанцінопалю узбунтаваліся два палкі салдат.

Мацунак Гэрман'і лопая.

Гэрманью да смерці папужала тоя, што Баугар'я зрабіла замірэньня. Гэта грозіць ей гібяллю. На заходнюм хронця хаурусьнікі пясціханна іх паціскаюць. Войска згубіла увесь мацунак. Сярод правіцяльства разлад. Два міністры папілі у адстауку. Думаюць зрабіць каляцыйная правіцяльства.

З-Расеі.

Радавыя іменьня.

На мейстох выраблююцца пляны пабудовак радавых іменьняу, дзе думаюць заводзіць паказноя сельская гаспадарства. Думаюць залажыць такія гаспадарствы у найболяй багатых і бойных іменьнях...

Там, дзе чэха-славакі з белагвардзейцамі.

Прыехаушыя у Саратау з Самары кажуць, што тамашнюю буржуазею і згоднікау ахапіу сполах. Камітэт кадэтау сабрау свае манаткі і уцек у Вуху. З Самарскаго вастрогу вывозяць арыштованых савецкіх дзеячау і чырвонаармейцоу і боляй бяспечныя мейсты.

На Забайкальскуй чугунца белагвардзейцы абвясцілі „прыказам, што павінны накінуць службу як найхуччэй усе тыя рабочыя і служачыя, якія якокьвячы падтрымоувалі бальшавікоу.

Здзек белагвардзейцау.

З Новарасейску павядамляюць аб тых здзеках пад прыхільнікамі радавае уласці, якія ушчынялі белагвардзейцы, забраушы гэты горад. На вуліцы разсекалі шаблямі, хто пападаусл у вопраццa матросау, ці у рабочуй кашулі. Кітайцау сэвтаулялі капаць ямы і жывымі закоплаць. На вакзаля застаупыя літоуцы і ватыппы былі пасечаны на дробныя часткі.

Радактуя і ведае Друкарскі Атдзел Беларускаго Нацыянальнаго Камісарыяту.

Типографія Сов. Раб. Деп. Москва, Тверская, Мамоновскій пер., д. 12.